*Л.П.СІВУРАВА*

# ТЭХНАЛОГІЯ ФЕСТЫВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў СФЕРЫ НАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ (на прыкладзе Мінскай вобласці)

*У артыкуле пададзены вынікі даследавання святочна-фестывальнай дзейнасці ў сферы народнай мастацкай творчасці, якое было праведзена аўтарам у Мінскай вобласці ў 2007 г. У выніку даследавання абагульнена і сістэматызавана інфармацыя аб 15 абласных фестывалях народнай мастацкай творчасці і святах-конкурсах народных рамёстваў (1991−2007 гг.). Тэхналогія фестывальнай дзейнасці паказана ва ўзаемасувязі тэорыі і практыкі.*

У сучасным грамадстве ўзрастае роля культурнай дзейнасці па ўключэнні чалавека ў соцыум, яго сацыялізацыі і сацыяльнай адаптацыі, ва ўмацаванні грамадскіх сувязей паміж людзьмі, вырашэнні праблем іх сумеснага існавання [1, с. 25−30]. Фестывальная дзейнасць вырашае мастацка-эстэтычныя, сацыяльна-педагагічныя і эканамічныя задачы, рэалізуе разнастайныя функцыі культуры [16, с. 16−35]. Яна ярка ілюструе працэсы развіцця беларускай культуры на мяжы XX–XXI стст. [12, с. 85−89].

Фестывальная дзейнасць гістарычна склалася і дынамічна развіваецца ў нашым грамадстве як сацыяльная з’ява, якая адлюстроўвае найбольш актуальныя ідэі і патрэбнасці грамадства – ідэі гуманізму, духоўнасці, грамадскага прагрэсу, эстэтычнага развіцця асобы і соцыуму.

У канцы XX – пачатку XXI ст. фестывальная дзейнасць выйшла за межы сферы мастацкай творчасці (музыкі, тэатра, харэаграфіі, кіно), пашырыла свае сацыяльна-культурныя вартасці, знайшла прымяненне ў іншых сферах – навуцы і прыродазнаўстве (фестывалі навукі, экалагічныя фестывалі), эканоміцы (фестывалі-кірмашы, фестывалі рэкламы, фестываль малака), адукацыі (фестываль адукацыйных тэхналогій), спорце (фестываль хакея) і інш.

Даследчыкі прыходзяць да высновы, што “фестывалізацыя культурнага жыцця грамадства” становіцца адметнай з’явай сучаснасці [4, с. 10], і аддаюць шмат увагі высвятленню прычын такога феномена. У апошнія гады з’явіліся публікацыі, прысвечаныя гэтай тэме. У ліку іх назавём працы “Фестивальная практика на юго-востоке Архангельской области” М.Мяжуева, 1999 [3], “Фестивальная практика: опыт case-study” Б.Перыля, 2002 [7], “Основы кинофестивального менеджмента” пад рэд. Г.Палічкі, 2003 [6], “Менеджмент музыкальных фестивалей” М.Белаблоцкага, 2003 [2], “Фестивальный менеджмент. Российский и зарубежный опыт” пад рэд. У.Бабкова, 2007 [15], дастаткова глыбокія дысертацыйныя даследаванні “Фестиваль как социокультурный феномен современного театрального процесса” А.Меньшыкава, 2004 [4], “Тенденції розвитку міжнародних фестивалів сучасної музики в Україні на новому етапі (1990–2005)” М.Шведа [17] і інш. У шэрагу прыярытэтных аспектаў даследавання праблемы – менеджмент, маркетынг святочна-фестывальнай дзейнасці.

Варта адзначыць, што тэорыя фестывальнага менеджменту слаба канкрэтызаваная ў сферы народнай мастацкай творчасці. У неад’емнай узаемасувязі паміж тэорыяй і практыкай апошняя значна апярэджвае ступень яе тэарэтычнага асэнсавання, што ўяўляе сабой пэўную дылему. Хаця ў гэты перыяд у Беларусі прыметна ўзрасла актыўнасць у правядзенні фестывальных мерапрыемстваў [8, с. 697−698], спецыялісты дадзенай сферы слаба дасведчаныя ў апошніх тэарэтычных напрацоўках. Да нашага часу не атрымалі належнай распрацоўкі навукова-тэарэтычны, эканамічны, тэхналагічны аспекты дадзенай грамадска-культурнай з’явы. Актуальнымі задачамі застаюцца асэнсаванне навуковых і практычных дасягненняў папярэдніх гістарычных перыядаў, абагульненне перадавога міжнароднага і айчыннага вопыту фестывальнай дзейнасці, удасканаленне фестывальнага менеджменту і маркетынгу.

На працягу 1997–2007 гг. у шэрагу работ аўтарам разглядаліся пэўныя гісторыка-культуралагічныя і сацыяльна-педагагічныя аспекты развіцця святочна-фестывальнай дзейнасці ў сферы народнай мастацкай творчасці ў Беларусі [8; 9; 10; 11; 12; 13; 16], аднак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступень распрацаванасці гэтай тэмы нельга назваць дасканалай. Прапануемы артыкул прысвячаецца абагульненню вынікаў даследавання фестывальных і святочных традыцый у сферы народнай мастацкай творчасці Мінскай вобласці, якое было праведзена аўтарам у 2007 г., і выяўленню тэхналогіі фестывальнага менеджменту ў дадзенай сферы.

У ходзе даследавання вырашаліся наступныя задачы: прасачыць гісторыю фестывальнага руху ў рэгіёне, выявіць методыку яго арганізацыі, ацаніць сацыяльна-культурную значнасць і мастацка-творчыя вынікі. Падчас даследавання ўпершыню была абагульнена і сістэматызавана інфармацыя аб 15 найбольш значных абласных фестывалях народнай мастацкай творчасці і святах-конкурсах народных рамёстваў, якія сталі жыццёвай рэальнасцю ў перыяд найноўшай гісторыі Беларусі (1991−2007). Самыя значныя культурныя акцыі абласнога маштабу былі прааналізаваны з пункту гледжання характару, ідэйна-мастацкай накіраванасці, методыкі арганізацыі і правядзення.

Сістэма падтрымкі развіцця народнай мастацкай творчасці ў Мінскай вобласці пачала фарміравацца ў другой палове XX ст. Яе арганізацыйная структура ўключае два ўзроўні: абласны і рэгіянальны. Абласны ўзровень склалі ўпраўленне культуры Мінскага аблвыканкама і Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці; рэгіянальны – органы выканаўчай улады, арганізацыйна-метадычныя цэнтры і ўстановы на месцах: раённыя выканаўчыя камітэты, раённыя метадычныя службы. Вынікам іх супрацоўніцтва на працягу папярэдняга перыяду сталі размежаванне функцый і выразнае ўзаемадзеянне цэнтра і рэгіёнаў. Працэсы кіравання развіццём народнай мастацкай творчасці сфарміраваліся ў сістэму, арганізацыйна-творчым ядром якой сталі фестывалі і святы-конкурсы.

У пачатку XXI ст. у сферы народнай мастацкай творчасці Мінскай вобласці выпрацавалася жанрава-відавая дыферэнцыяцыя фестывальных акцый. Вылучыліся аднажанравыя фестывалі вакальнага (“Пеўчае поле”, з 1952), інструментальнага (“Майскі вальс”, з 1981, “Сымон-музыка”, з канца 1980-х), харэаграфічнага (“Карагод сяброў”, з 2000), тэатральнага мастацтва (“Бярэзінская рампа”, з 1997, “Чароўны куфэрак”, з 1988) і мнагажанравыя (“Напеў зямлі маёй”, з 2001, “Свет творчасці, свет захапленняў”, з 2005, фестывалі гумару, з 1996) і інш.

Праграма фестывальных мерапрыемстваў уключае разнастайныя па змесце і форме часткі: для аўдыторыі гледачоў (шоу-праграмы: канцэрты, спектаклі, паказы, конкурсы, агляды, выставы, балі, карнавалы, турніры, вогненныя і водныя феерыі, конкурсна-гравыя праграмы, забаўляльныя мерапрыемствы, дабрачынныя акцыі, святочны гандаль і інш.); для ўдзельнікаў (знаёмства з помнікамі гісторыі і культуры, экскурсіі, наведванне нацыянальных паркаў, паркаў атракцыёнаў, вытворчых прадпрыемстваў, вучэбных устаноў, тэатраў, музеяў, салонаў, галерэй, сустрэчы з творчымі асобамі, вечары адпачынку, урачыстыя сустрэчы з кіраўніцтвам горада, прыёмы ў мэрыі, адміністрацыі вобласці, райвыканкаме і інш.); для спецыялістаў сацыякультурнай сферы (творчыя конкурсы, лабараторыі, семінары, практыкумы, школы перадавога вопыту, майстар-класы, навукова-практычныя канферэнцыі, фальклорныя чытанні, сяброўскія вечарыны, пікнікі, фуршэты і інш.); для прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі (прэс-канферэнцыі і інш.) [11].

Формы традыцыйнай народнай культуры атрымліваюць найбольш поўнае развіццё праз іх актуалізацыю ў сучаснай мастацкай практыцы. Масаваму ўключэнню ў стваральныя працэсы культуратворчасці спрыяюць святы-конкурсы народных рамёстваў, якія сталі традыцыйнымі на Міншчыне ў другой палове 90-х гг. XX ст. Святы-конкурсы народных рамёстваў – масавыя сацыяльна-культурныя мерапрыемствы, якія праводзяцца з мэтай выяўлення стану і перспектыў развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, яго прапаганды і папулярызацыі, стымулявання дзейнасці народных майстроў, удасканальвання працэсаў кіравання развіццём народнай мастацкай творчасці. На Міншчыне рэгулярна праводзяцца святы ганчарства “Гліняны звон” (з 1996), ткацтва “Матчыны кросны” (з 2000), выцінанкі “Папяровыя карункі” (з 2002), саломапляцення “Саламяныя дзівосы” (з 2002), разьбяроў па дрэве “Разьбы зачараванне” (з 2001), майстроў лозапляцення “Лазовыя карункі” (з 1998), “Беларуская лялька” (з 2007) і інш.

Святы-конкурсы арганізуюцца з пэўнай перыядычнасцю часцей за ўсё у традыцыйных цэнтрах развіцця рамёстваў – ганчарства, пляцення, ткацтва, кавальства і інш. Гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праекты ажыццяўляюцца пераважна па ініцыятыве і на сродкі дзяржаўных органаў і ўстаноў. Арганізацыйную падтрымку ім аказвае абласны цэнтр народнай творчасці.

Праграма свят-конкурсаў уключае спаборніцкую і мастацкую часткі. Удзельнікі дэманструюць мастацкія вырабы на выставах, а таксама спаборнічаюць у іх вырабе непасрэдна падчас мерапрыемстваў. Конкурсныя работы разглядаюцца на адпаведнасць традыцыям беларускай народнай культуры, ацэньваюцца па хуткасці, якасці, тэхнічным і мастацкім узроўні выканання. Ацэнку работ народных майстроў ажыццяўляе экспертная рада (журы) з ліку кампетэнтных спецыялістаў пэўных жанраў. Для заахвочвання пераможцаў выкарыстоўваюцца ганаровыя званні (лаўрэат, дыпламант), граматы, дыпломы, грашовыя прэміі, каштоўныя падарункі і інш. Мастацкае афармленне свят-конкурсаў уключае выставачныя, канцэртныя, тэатралізаваныя, забаўляльныя і іншыя мерапрыемствы. Умовы і вынікі свят-конкурсаў вызначаюць прыярытэты ў развіцці жанраў народнага мастацтва [9].

Адным з самых новых эксперыментальных праектаў цэнтра стала Першае абласное свята-конкурс “Беларуская лялька”, якое праводзілася 29 верасня 2007 г. у г. Слуцку. Яно сабрала 80 майстроў і іх вучняў з 20 раёнаў вобласці. Дарэчы, каля 50 чалавек – вучні сельскіх і раённых школ, якія займаюцца ў студыях і гуртках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Задачамі свята сталі вывучэнне, захаванне і папулярызацыя традыцыйных формаў беларускай лялькі, вывучэнне сучаснага стану і перспектыў яе развіцця, прапаганда і папулярызацыя мастацтва беларускай лялькі сярод насельніцтва, стымуляванне яго развіцця ў сучасных умовах, прыцягненне дзяцей і моладзі да заняткаў традыцыйнымі рамёствамі, вырабу традыцыйных строяў і заняткаў фальклорам. Вызначаліся пераможцы ў намінацыях “Лепшая тэкстыльная лялька ў этнаграфічным або гістарычным гарнітуры”, “Лепшая тэкстыльная лялька – фальклорны персанаж”, “Лепшая саламяная лялька”, “Лепшая ільняная лялька”, “Лепшая калекцыя хатніх работ”, “Лепшая лялечная кампазіцыя”, “Традыцыйная лялька майго рэгіёну”. На свяце-конкурсе былі адзначаны лепшыя майстры, настаўнікі, асобныя прызы атрымалі самыя малодшыя ўдзельнікі. Свята паслужыла новым штуршком для развіцця мастацтва па вырабе лялек і было скіравана на мастацка-эстэтычнае, маральнае і працоўнае выхаванне дзяцей.

З папярэдняга невялічкага экскурсу бачна, што практыка фестывальнай дзейнасці надзвычай багатая і разнастайная. Яна мае сваю рэгіянальную і жанравую спецыфіку. Аднак даўно наспела неабходнасць ажыццяўляць сістэмны падыход да рэалізацыі фестывальных мерапрыемстваў, які павінен грунтавацца на ўстойлівым тэарэтычным падмурку. Належыць падсумаваць тэхналогію фестывальнай дзейнасці, якая мае агульныя часткі незалежна ад жанрава-відавой, нацыянальна-культурнай і іншай спецыфікі.

Пры ўсёй складанасці і разгалінаванасці фестывальнага менеджменту аўтары вучэбнага дапаможніка “Основы кинофестивального менеджмента” пад рэдакцыяй Г.А.Палічкі выдзелілі ў ім асноўныя аспекты кіравання:

1. Фінансавы менеджмент, 90% якога складае фандрэйзінг, гэта значыць фарміраванне фестывальнага бюджэту за кошт прыцягнення і акумуліравання сродкаў з розных крыніц. Гаворка ідзе першым чынам аб пошуку фундатараў. Фандрэйзінг звычайна звязаны з бартэрам: рэклама фундатара, у тым ліку і іміджавая, у фестывальнай PR-прасторы ў абмен на сродкі для рэалізацыі вызначанай часткі фестывальнай праграмы. Таму фандрэйзінг – гэта форма сацыяльна-культурнага партнёрства фестывалю і фінансавага донара.

2. Праграмны менеджмент, які ўключае кіраванне мастацкай часткай фестывалю. Гэта праца па адборы і фарміраванні конкурсных і пазаконкурсных кінапраграм, рэтраспектыўных паказаў, арганізацыя майстар-класаў, семінараў, творчых прафесійных клубаў і да т.п. Сюды ўваходзяць кіраўніцтва адборачнай камісіяй у міжфестывальны перыяд, супрацоўніцтва з журы і службамі паказу, прэс-цэнтрам падчас фестывалю, падвядзенне вынікаў і ўдакладненне фестывальнай канцэпцыі ў пасляфестывальны перыяд.

3. Кіраванне персаналам, якое прадугледжвае падбор, расстаноўку кадраў усіх фестывальных службаў і аддзелаў: выканаўчай дырэкцыі, фінансавага аддзела, адборачнай камісіі, праграмнай дырэкцыі, службы PR і рэкламы, аддзела інфраструктуры і дыслакацыі, службаў паказу і інш. Кіраванне персаналам з’яўляецца галоўным,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прэрагатыўным відам дзейнасці прадзюсера фестывалю і яго непасрэдных памочнікаў і намеснікаў, якая ажыццяўляецца не толькі ў перыяд правядзення мерапрыемства, але і на працягу ўсяго фестывальнага года.

4. Кіраванне інфраструктурай і дыслакацыяй, якое ўключае кантроль і кіраўніцтва дапаможнымі службамі па месцы дыслакацыі фестывалю, сярод іх наступныя: служба прыёму і размяшчэння; транспартная служба; аддзел абслугоўвання замежных гасцей і VIP (хоспіс, бытавыя пытанні і інш.); служба паказу і кантролю за прасоўваннем тэатральнага прадукту; служба спецыяльных і культурных праграм (кава-брэйк, гутаркі, начныя клубы, прадстаўнічыя мерапрыемствы) і інш.

5. Прававы менеджмент фестывалю, куды ўваходзяць дагаворныя аспекты, кантроль за квотай фестывальных паказаў, захаваннем аўтарскіх і сумежных правоў, правіл страхавання рызыкі дастаўкі і выкарыстання спектакляў і інш.

6. Маркетынг, PR і рэклама, якія не толькі вызначаюць “твар” фестывалю, але шмат у чым і поспех фандрэйзінгу. Гэтая дзейнасць ажыццяўляецца на працягу ўсяго фестывальнага года шляхам арганізацыі спецыяльных мерапрыемстваў, спланаваных у адпаведнасці са стратэгіяй і тактыкай агульнафестывальнага менеджменту (сайт у Інтэрнеце, прэс-канферэнцыі, творчыя сустрэчы, балі, конкурсы, марафоны, дабрачынныя абеды, латарэі і інш.). Падчас правядзення фестывалю – гэта выпуск фестывальнага друкаванага органа і яго тэлевізійнай версіі, урачыстыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця фестывалю, праца фестывальнага прэс-цэнтра, а таксама маніторынг прэсы і складанне прэс-дасье ў першы постфестывальны перыяд. Дадзены аспект фестывальнага менеджменту ўключае таксама і мерчандайзінг, гэта значыць выпуск і рэалізацыя спадарожных тавараў з фестывальнай сімволікай [6, с. 8−10]. Такія асноўныя кірункі фестывальнага менеджменту, якія рэалізуюцца падчас значных, у першую чаргу міжнародных, фестывальных праектаў, пераважна ў сферы прафесійнага мастацтва.

Тэхналагічны модуль фестывалю прапануе М.Мяжуеў [3].

У сферы народнай мастацкай творчасці таксама выкарыстоўваюцца даныя тэхналогіі кіравання фестывальнымі праектамі, але ў меншых маштабах, што тлумачыцца нязначнасцю фінансавых выдаткаў на іх рэалізацыю.

Тэхналогія рэалізацыі фестывальных праектаў і свят-конкурсаў, якая склалася ў Мінскай вобласці, уключае навукова-метадычнае, нарматыўна-прававое, фінансава-эканамічнае, матэрыяльна-тэхнічнае, інфармацыйна-рэкламнае, кадравае забеспячэнне. Асноўнымі этапамі рэалізацыі праграмы мерапрыемства з’яўляюцца пастаноўка праблемы, падрыхтоўка рабочага плана, каштарыса выдаткаў і прыбыткаў, правядзенне свята-конкурсу, узнагароджанне ўдзельнікаў, аналіз і афармленне выніковых дакументаў. Мэта і задачы мерапрыемства фармулююцца і ажыццяўляюцца ініцыятыўнай групай, адказнымі асобамі ўстаноў і арганізацый, з ліку якіх ствараецца арганізацыйны камітэт. Ён зацвярджае палажэнне, дзе адлюстраваны ідэйна-тэматычная задума мерапрыемства, месца і тэрміны яго правядзення, структура, умовы ўдзелу, а таксама асноўны фінансавы дакумент – каштарыс. Пры неабходнасці арганізацыйны камітэт фарміруе выканаўчую дырэкцыю [11, с. 703–704].

Мэты і задачы правядзення культурных акцый у маштабах вобласці, іх мастацкі змест у абагульненым выглядзе выяўляюць скіраванасць дадзеных мерапрыемстваў на выхаваўчыя і творчыя вынікі, што з’яўляецца своеасаблівай ідэалогіяй мастацкага развіцця ў Мінскай вобласці. Праз праграмнае ўтрыманне культурных акцый раскрываецца палітра інтарэсаў носьбітаў і стваральнікаў сучаснай народнай мастацкай культуры. Прыведзеная інфармацыя сведчыць аб разнастайнасці інтарэсаў насельніцтва ў дадзенай сферы, а таксама аб умелым спалучэнні арганізацыйна-кіраўніцкіх і мастацка-творчых намаганняў для дасягнення значных сацыяльна-культурных вынікаў.

Фестывальныя традыцыі ў народнай мастацкай творчасці не толькі яскрава ілюструюць мастацкі патэнцыял працаўнікоў Мінскай вобласці, але і пазітыўна характарызуюць арганізацыйныя намаганні кіраўніцкага апарату ў галіне сацыяльна-культурных працэсаў стварэння, засваення, захавання, распаўсюджвання і развіцця каштоўнасцей культуры ў Цэнтральным рэгіёне Беларусі.

Абласныя фестывальныя мерапрыемствы з’яўляюцца складовай часткай дзяржаўнай культурнай палітыкі і паказчыкам сістэмнай і мэтанакіраванай дзейнасці па падтрымцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнай мастацкай творчасці ў рэгіёне. Па сутнасці, яны складаюцца ў сістэму арт-менеджменту, які, па меркаванні даследчыка Г.Н.Новікавай, уяўляе сабой “прафесійнае кіраванне працэсам стварэння мастацкіх каштоўнасцей, прасоўванне на рынак культурных паслуг вынікаў творчай дзейнасці аўтараў” [5, с. 20].

Фестывальная дзейнасць у сферы народнай творчасці з’яўляецца дзейснай формай яе падтрымкі. Яна дэманструе дасягненні аматарскіх фарміраванняў і народных майстроў, выяўляе стан, тэндэнцыі і праблемы развіцця народнай мастацкай творчасці. Задача фестывальнай дзейнасці – не толькі стварыць свята, узбагаціць гледачоў і ўдзельнікаў станоўчымі эмоцыямі. Такія мерапрыемствы з’яўляюцца творчай майстэрняй для кіраўнікоў і арганізатараў народнай мастацкай творчасці, садзейнічаюць развіццю рэгіянальнай культуры. Фестывальная дзейнасць у сферы народнай мастацкай творчасці – гэта актыўная форма захавання і памнажэння культурнага патэнцыялу беларускага грамадства.


1. *Ариарский, М.А.* Прикладная культурология / М.А.Ариарский. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб.: ЭГО, 2001. – 288 с.

2. *Белоблоцкий, Н.* Менеджмент музыкальных фестивалей / Н.Белоблоцкий // ART-менеджер. – 2003. – № 2.

3. *Межуев, М.* Фестивальная практика на юго-востоке Архангельской области / М.Межуев // Экология культуры: информ. бюллетень. – 1999. – № 2 (9).

4. *Меньшиков, А.М.* Фестиваль как социокультурный феномен современного театрального процесса: автореф. … канд. искусствоведения / А.М.Меньшиков. – М., 2004. – 21 с.

5. *Новикова, Г.Н.* Технологии арт-менеджмента: учеб. пособие / Г.Н.Новикова. – М.: МГУКИ, 2006. – 178 с.

6. *Основы* кинофестивального менеджмента: учеб. пособие / под ред. Г.А.Поличко. – М.: ГУУ, 2003. – 209 с.

7. *Periль, Б.В.* Фестивальная практика: опыт case-study / Б.В.Периль // Экология культуры: информ. бюллетень. – 2002. – № 3 (28). – С. 24–73.

8. *Сивурова, Л.П.* Любительское художественное творчество / Л.П.Сивурова // Современная Беларусь: энцикл. справочник: в 3 т. / редкол.: М.В.Мясникович [и др.]. – Мн.: Бел. наука, 2007. – Т. 3. – С. 683–729.

9. *Сивурова, Л.П.* Праздники-конкурсы народных ремесел / Л.П.Сивурова // Минская область: энциклопедия: в 2 т. / редкол.: Л.Ф.Крупец, Г.П.Пашков [и др.]. – Мн.: БелЭн, 2007. – Т. 2. – С. 509–510.

10. *Сівурава, Л.П.* Сацыяльна-культурная эфектыўнасць фестываляў дзіцячай творчасці / Л.П.Сівурава // Воспитательное пространство внешкольного учреждения: восхождение к будущему: сб. материалов Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 28–29 апр. 2004 г.). – Мн., 2004. – С. 123–126.

11. *Сивурова, Л.П.* Фестивали / Л.П.Сивурова // Минская область: энциклопедия: в 2 т. / редкол.: Л.Ф.Крупец, Г.П.Пашков [и др.]. – Мн.: БелЭн, 2007. – Т. 2. – С. 703–704.

12. *Сівурава, Л.П.* Фестывальная дзейнасць у галіне народнай мастацкай творчасці ў Беларусі на мяжы XX–XXI стст. / Л.П.Сівурава // Веснік Бел. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 4. – С. 85–89.

13. *Сівурава, Л.П.* Фестывальная дзейнасць як фактар захавання і развіцця культуры ў рэгіёнах Беларусі / Л.П.Сівурава // Повышение роли клубных учреждений в социокультурной жизни регионов: материалы респ. науч.-практ. конф. (Минск, 22–23 ноября 2006 г.). – Мн.: БелГИПК, 2006. – С. 116–123.

14. *Стрельцов, Ю.А.* Культурология досуга: учеб. пособие / Ю.А.Стрельцов. – М.: МГУКИ, 2003. – 296 с.

15. *Фестивальный* менеджмент. Российский и зарубежный опыт: сб.ст. / сост. и ред. В.А.Бабков. – М.: Art-менеджер, 2007. – 424 с.

16. *Фестывальны* менеджмент у сферы народнай мастацкай творчасці: праграма курса / распрац. Л.П.Сівурава. – Мн., 2005. – 48 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Швед, М.Б.* Тенденції розвитку міжнародних фестивалів сучасної музики в Україні на новому етапі (1990–2005 рр.): автореф. дис. ... канд. мистецтвознавства: 17.00.01 / М.Б.Швед; Львів. держ. муз. акад. ім. М.В.Лисенка. – Львів, 2006. – 20 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ